Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з пэрэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 16 мая 1913 г. №. 20.

## Рэка пайшла!

„Асьвяты, дайце нам сьвету!“— за апошні час ўсе болей і болей нясецца з (родных) глухіх куткоў нашай бацькоўшчыны. Беларусь прачыхаецца ад цяжкага сна. Аграмадные сілы яе сыноў, што дзесяткамі вякоў йшлі на змаганьне з голадом і холадом, з крыўдай ворагоў, што як стада ваўкоў з даўніх пор шукаюць сваей дабычы— гэта вялікая сіла прабуджаецца.

Пасьля доўгай, халоднай зімы, аж пакуль не пачарнеюць дарогі і не пачнець капаць са стрэх,—ня верыцца што прыходзіць яна—чараўніца весна. Але паглядзіце што гэта робіцца на рэчцы? Штось яна саўсім пацямнела, ўздулася; часдругі—і страшэнные енкі напоўняць паветрэ: трашчыць лёд, грамадзяцца крыгі адна на другую,—рэка выходзіць на прастор і наводняе ваколіцу. Чараўніца весна, страшэнна ты, калі начынаеш бразгаць кайданамі і з вялікім стагнаньнем неакрэпшай сілы ўсё-ж разрываеш путы зімы. «Рэка пайшла!» Усе рады і так прыветліва лёгка робіцца на сэрцы.

Весткі аб прыходзе болей светлаго часу далетаюць да нас нават з атстаўшых куткоў Беларусі. Во што пішэ вучыцель з Магілёўшчыны (у „Недзеле“) „у будучыне ешчэ шмат прашкод; але ўсё ж агульны кірунак нашаго земляроба ў школу дае нам новые сілы ў нашай працы, даўно ўжо школа—набіта, а ўсё-ж вядуць і вязуць дзяцей ў школу, з болем у душы прыходзіцца атказываць з недастатку мейсц. У гэтым кірунку вёскі да сьвету—надзея сьветлай будучыны нашай Беларусі. Калі чытаеш гэтые словы вясковаго вучыцеля, няволна прыпамінаецца прыход вялікай сілы прыроды—вясны. Ніхай хаваюцца (тые) слабые серцы і бедные духам, што баяцца тэй сілы, што з дзікім бразганьнем разрывае путы гора, пьянства, нешчасьця. Але шчырые серцы з моцнай і праўдзівай душой не убаяцца тэй вялікай сілы, што хочэ прастору, сьвету, цепла.

„Сьвеціць сонцэ, жаром пышэ“... —Гэтак пэўне будуць калісь пець і тые што убаяліся сьвятой працы, каторая цяпер ляжыць на кожным сьвядомым з грамадзян. А праца гэта—вялікая. Школы, чытальні, бібліотэкі—справы вельмі патрэбные ў нашым жыцьці. І чым болей мы будзем працаваць дзеля гэтаго, тым скарэй у нас яны будуць.

Калі б кожная вёска, гдзе ёсць вучыцель, фэльчэр, сьведомые грамадзяне—захацела-б мець сваю бібліотэку—гэта не так цяжка зрабіць. Нашы вёскі маюць ў сярэднім ня меней як са 30 хат і калі-б усякі гаспадар захацеў бы ахфяраваць поўрубель у год (пэўне на гарэлку больш прапусціць ў год, як поўрубель), то за 15 рублёў у год вёска магла бы мець са 2—3 газэты і са два журналы гаспадарскіх тыднёвых і месячных.

У Расеі цяпер, а заграніцай даўно па гарадах, сёлах і нават вёсках устраіваюць цэнтры культурнаго жыцьця грамадзян—Народные Дамы. Тые, што ня відзяць вялікай карысьці ў пьянстве, сварках і ў цемнаце, пачынаюць спачатку па капейцы збіраць капітал на вялікую справу—Народны Дом. Праходзіць год, другі, трэці, і з крупных грашей беднага вясковаго люду строіцца вялікая, просторная будоўля, гдзе ўсяк, можэ прысьці і сказаць: „гэта мой дом, мой куток“. А ў гэткім кутку—свая бібліотэка, чытальня з уселякімі газэтамі, тэатр (труппа збіраецца з мейсцовай маладзежы), музэй з уселякімі калекціямі расьлін, зьвероў, рыб, мінэралоў; памяткі мінўшчыны свайго краю і пробкі хатняго рэмесла і гаспадарства ды др., тамака маюцца адзелы дзеля хаўрусоў, суполак і друг. Словам пасьля Божаго дома (цэркві ці касьцёла)—Народны дом займае першае мейсцо ў жыцьці народа;— і калі пры ўсей нашай беднасьці можэм панатужыцца, каб з астатніх грашэй строіць касьцёлы і цэрквы, то зложыўшы тые капейкі, што у нас ідуць на пьянства, агулам такімі грашамі можэ ва ўсей Беларусі збіраецца не адзін мільён рублеу, за 2—3 гады мы сьмела маглі-бы мець у кожнай вёсцы школу і чытальню, а ў вялікіх сёлах, ў мястэчках і па гарадох Нардные домы.

Міхалка С.

## Аб беларускім хатнім рэмясьле.

Хто быў у Беларусі на якім большым кірмашы, той, мабыць, бачыў там цэлые горы дрэўлянай пасуды, рэшаты, дугі, санкі, павозкі, шмат ганчаркі, розные цацкі, цэлые вазы смаргонскіх абаранкоў, розные палотны і без ліку уселякай драбязы. Усё гэта зроблена рукамі хатніх майстроў-беларусоў, літвіноў і др. Але калі паглядзець на розные дрэўляные, гліняные, паперные і др. выробы расейскіх рэмесьнікоў, каторые прывозяць да нас напрыклад з гор Семёнава, Ніжэгародзкай губэрні, с Троіцко Сергіева-Пасада, с пад Масквы, ды с Польшчы, то зразу відаць, што выробы нашых майстроў нельга раўнаваць з выробамі расейскіх і польскіх рэмесьнікоў.

Узяць хоць-бы карзінкі: с польшчы прывозяць да нас карзінкі розных сартоў, работа акуратная, чыстая, крэпкая, прыгожая. А нейкі беларус, ці літвін прадае карзінкі, каторых і паставіць побач з расейскімі ці польскімі сорамна.

Прадаюцца ешчэ на кірмашах начоўкі, ушаты, кадкі, але і гэтые выробы цяжкіе, незграбные, не відаць таго на іх, каб той, хто іх рабіў, працаваў ня толькі рукамі, але і галавой і гэтые выробы з году на год выціскаюцца лягчэйшымі і зручнейшымі фабрычнымі. Дугі прывозяць на нашы кірмашы с Калугі, а лясоў і у нас многа. Гэтак сама і нашы ганчары на перад ня йдуць: вырабляюць толькі самую простую пасуду, каторай ужо што раз меней прадаецца, бо заступае яе куды гладзей і прыгажэй вырабленая латышская і расейская паліва. А гліны добрай, у нас многа і ганчарку можна было-б наладзіць: у Івенцы (Мінск. губ.), напрыклад, робяць нават добрые кахлі, але затое гладышы, міскі, місачкі толькі такіе, якіе хіба Каін з Авелям ешчэ ляпілі на пастві, забаўляючыся.

Німала у нас на Беларусі тках і прах, а як паглядзіш на кірмашы той тавар, што прынесен на продаж, то ажно сорамна робіцца за нашых гаспадыняк ды дзеўчатак-красачак, што у іх ручкі як граблі. Праўда, іхвіе бабкі і маткі умелі ешчэ нешта дарэчнае выткаць, але у дачок і ўнучак німа ўжо, дзякаваць Богу таго складу.

Дажыліся мы ужо і да таго, што выстаўкі робяцца хатняго рэмесла. Была гэткая выстаўка у Пецярбурзе, вялікая, багатая. Напрысылалі туды сваім дабром пахваліцца усе народы і татары і кіргізы і палякі і літвіны і расейцы і украінцы і, даруй ты Божэ грэх, самаеды,—а з Беларусі паехалі івенацкіе ды ракоўскіе гаршкі, радняные посьцілкі ды ешчэ нейкая дробязь, што самім сорамна глядзець, а ня тое, каб ешчэ добрым людзям вочы мазоліць імі.

І вось ходзюць людзі па выстаўцы глядзяць, дзівуюцца складу ў руках і ладу ў мазгах у латышоў, у фінляндцоў, у каўказцоў, а як падойдуць да беларускаго атдзелу, то і рукамі ляснуць:—„дзе-ж гэта ешчэ захаваўся такі дзікі народ?!“

Не дармо адна немка казала другой, пабачыўшы зрысаваных на аткрытцы пару нашых валоў у ярме „Das ist weissrusische automobil“ (Гэта беларускі аўтомобіль). Бо яно такі праўда, што у нас усё не па людзку!

У Расеі, у Польшчы, а апошнімі часамі у нашых найбліжэйшых суседзёў у Літвіноў, Латышоў, Украінцоў хатнім рэмяслом цікавіцца уся інтэлігенція, развіваюць мейсцовы узор, мейсцовую тэхніку, да кожнай мейсцовай асобнасьці адносяцца як да скарбу каторы трэба захаваць, развіць. А у нас наша інтэлігенція усімі сіламі стараецца згладзіць мейсцовае, а насадзіць чужое, прыноснае. Гэтак, аткрылася у Дзісьне стараньнем мейсцоваго обывацельства ткацкая школа і, бадай ці ня тры гады вучыла, як трэба ткаць маскоўскіе сарпінкі. Ды ешчэ дзівіліся добрые людзі, што не было ахвотніц у іх вучыцца!

У Быхаве, Могіл. губ. у рэмесьленнай школі для хлопцоў вучаць ткаць каўказскіе дываны, ня ведаючы таго, што калісь у нас ткалі дываны, не каўказскім раўня. Гэткіх прыкладоў я мог бы сотню, хіба налічыць, але хай на другі раз астанецца.

Паня Моль аткрыла ткацкіе варштаты у Вітэбшчыне і пачала ткаць «закопянскіе» узоры; цяпер на выстаўцы, дажджлівай памяці, у Гарадку нават паставілі кросны у будцы с кракоўскімі тканінамі і з беларускай—дзяўчынай, каторая паказывала, як ткаць кракоўскіе узоры.

Не, культура будуецца не такім парадкам. Гэта расьліна перэсаджэная не прыжывае на новым грунце. Трэба тые карані, што глыбока у грунці зарыты ажывіць. А інакчэй, гэта будзе толькі партызантка руйнуючая і нічога ня творачая.

Там, дзе інтэлігенціі не партызантка на вуме, а праўдзівая творчая работа, яна пастаралася утварыць музэі хатніх выробоў. Вось у Маскве, далёка не шукаючы, есць гэткі музей а пры ім склад хатніх выробоў; у музэі можна бачыць усё, што выраблялося даўней і што вырабляецца цяпер там, можна адтульбраць на форму рэчы; у складзе прадаюцца розные хатніе выробы з дрэва, жалеза, серэбра, золата, гліны, паперы, воўны, лёну. Даўней там селяне рабілі гэтак сама груба, як і нашы беларусы, але гэты музэй стаўся бацькам і маткай хатнім рэмесьнікам: ён пазычае ім інструмэнты, дае на павер матэрьялы, пасылае па вёсках добрых майстроў, каб яны вучылі вясковых людзей, што і як лепей рабіць; ён шукае мейсц, рынкоў, дзе можна прадаваць гэтые выробы, нават за граніцай. А ў нас, як у Мінску надумалося колькі людзей зрабіць склад хатніх выробоў, то не мейсцовых майстроў шукалі, але паслалі чэлавека накупіць хатніх выробоў у Варшаву і... бадай у Кіеў ешчэ.

У тым, што выробы хатняго рэмесла на Беларусі грубые, ня гэтулькі вінават сам народ наш, паміж катораго німала ёсць людзей кемных і маючых склад у руках, сколькі тутэйшая інтэлігенція, каторая маючы сякую-такую навуку і частагуста грошы павінна-б была пайсці на помач многагаратному народу, паміж которого яны жывуць.

У польшчы хоць і німа выборнаго земства, гэтак сама, як ня ўсюды яно есць і у нас, а дзе і есць то ўсё роўна не для нас, затое там мейсцовая інтэлігенція і нават паны крэпка узяліся за тое, каб памагчы хатнім рэмесьнікам. Там пааткрываны школы, у каторых хлопчыкоў і дзеўчатак вучаць рэмясла хатняго. Неколькі добрых людзей сабралі грошы і аткрылі школу у Налэнчове (Любл. губ.). У школі гэтай вучаць дарма. За тры гады у гэтай школі можна навучыцца рэмесла і быць ня згоршым майстрам. Можна вучыцца і меней — толькі шэсць месяцоў. То для хлапцоў, а для дзеўчатак каля гор Влоцлавка (Варш. губ.) у дварэ Крушынэк есць гэткая самая школа.

У нас у Беларусі нічога падобнаго німа, бо мы жывем пад апекай двух няняк, каторые уціраюць нам насы, каб было суха, а што сціраецца і што у бруху вурчыць ніхто гэтаго бачыць ня хочэ.

Кажуць палітыка...

Але-ж, паночкі! нельга унасіць туды палітыку, дзе ей ня можэ і не павінна быць мейсца. У помачы бяздольнаму, у штукарстве, у паднятцьці багацтва краю і народу нельга ўнасіць палітыку!

*В. Ласт.*

## Аб Беларускай песьні.

Прашу выбачыць мне, чытачу, што я раблю выпіскі такіе вялікіе але я хочу, каб песьня сама за сябе гаварыла, сама паказывала сваё харастводство, бо як там ні гавары, а калі сам нё бачыш і ня чуеш чаго, то ніколі ня будзеш знаць аб ём ўсяго. У другіх песьнях гаворыцца аб тым як здавалі у салдаты у часах прыгону. Ведама што у часы прыгону бралі ў салдаты ні так як цяпер, а каго пан скажэ ўзяць. Калі прыходзіць пара браць у рэкруты, то хлопцы, каторые спадзеваліся, што іх могуць забраць, хаваліся дзе каторы мог—у лес і да другіх паноў уцекалі, абы толькі не папасьціся войту ў вочы, і той, каторы скрыўся на той час, аставаўся ў хаці, а на яго мейсцо бралі другога. Ведама што пры такім парадку часта ў салдаты йшлі такіе хлопцы, ці мужчыны, каторым не павінна было йсьці.

Вот што аб гэтым пяе песьня. Сабраліся раз мужыкі і сталі раіць каго у салдаты атдаць. Гэта пачуўшы, хлопцы пачалі ўцекаць. Быў у ўдавы адзін сын. Сестра яго ўчула будучы у дварэ, што будуць браць у рэкруты і прыйшоўшы да дому сказала яму.

«Скачыў брат ў каморку, соцкі з

